Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
____________________Ю. П. Бондар
«___»_______________2011 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КЛАС СТАРАДАЎНЯЙ ХАРАВОЙ МУЗЫКІ

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-18 01 01*
*Народная творчасць (па напрамках)*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-01 01*
*Харавая музыка акадэмічная*

Мінск 2011

**Складальнікі:**

*А. В. Пякуцька,* загадчык кафедры харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*В. М. Новік,* дацэнт кафедры харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* харавога дырыжыравання ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»;

*М. П. Дрынеўскі,* кіраўнік дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча», прафесар, народны артыст Беларусі

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 22.10.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 14.12.2010 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *В. М. Новік*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Клас старадаўняй харавой музыкі» займае важнае месца ў сістэме падрыхтоўкі хормайстраў, бо яе матэрыял з’яўляецца асновай па засваенні вакальна-харавых і дырыжорскіх навыкаў і шчыльна звязана з выканальніцкай практыкай па харавым класе.

Асноўная *мэта* навучання – знаёмства студэнтаў харавога класа са стылістыкай, спосабам і манерай выканання харавых твораў розных эпох, школ і кірункаў ад Сярэднявечча ўключна да пачатку XX ст. На яркіх прыкладах замежнай, рускай і беларускай харавой літаратуры паказваецца гістарычнае развіццё, эвалюцыя і цэласная карціна дасягненняў усёй еўрапейскай харавой музыкі.

Дысцыпліна вядзецца ў цеснай сувязі з іншымі дысцыплінамі: «Гісторыя і тэорыя харавога мастацтва», «Гісторыя прафесійнага харавога выканальніцтва», «Класічная харавая літаратура (замежная, руская, беларуская)», «Дырыжыраванне»,» Хоразнаўства» і інш.

*Задачы* навучання:

– пашырэнне прафесійнага музычнага кругагляду на прыкладах класічных узораў харавой музыкі;

– авалодванне практычнымі ведамі аб асноўных жанрах, стылях старадаўняй музыкі;

– выхаванне ў студэнтаў навыкаў перадачы манеры выканання твора, усебаковага харавога аналізу партытуры, умення працаваць з творамі дадзенага кірунку.

Старадаўняя музыка дапамагае пашырыць уяўленне пра дыялектычную сувязь музычнага свету, падрыхтаваць студэнтаў да ўспрымання і разумення сучаснай музыкі. Вывучэнне прадмета дазваляе адначасова авалодаць методыкай па стварэнні і кіраванні камернымі (мужчынскімі) харамі.

Рэпертуар класа старадаўняй харавой музыкі на працягу ўсяго тэрміну навучання падбіраецца па прынцыпе гістарычна-прасторавай стылістычнай пераемнасці ў межах адведзеных вучэбных гадзін. Акрамя таго ўлічваюцца від і склад харавога калектыву (камерны, змешаны, аднародны ці ансамблевы). Большую частку праграмы складаюць творы a cappella, аднак мае месца і харавая музыка ў суправаджэнні аркестра ці фартэпіяна (выкананне месы або кантаты).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнты павінны *ведаць:*

– харавы рэпертуар, пройдзены за час навучання;

– музычна-стылявыя асаблівасці, ідэйна-вобразны змест выконваемых твораў;

– асноўныя жанры, стылістыку, манеру выканання харавой музыкі XVI–XIX стст.

– музычныя прыклады іншых кампазітараў, не звязаных з канцэртнай праграмай навучання на курсах.

Студэнты павінны *ўмець:*

– адрозніваць стылі кампазітараў разнастайных творчых напрамкаў;

– аналізаваць асобныя прыклады акапэльных ці з суправаджэннем харавых твораў камернай, кантатна-аратарыяльнай музыкі;

– спяваць ці найграваць партытуры вывучаемых твораў па нотах і на памяць.

Праца ў класе старадаўняй харавой музыкі ажыццяўляецца ва ўзаемасувязі з прадметамі музычна-тэарэтычнага, філасофска-эстэтычнага і музычна-педагагічнага цыклаў, з’яўляючыся па сутнасці практычным увасабленнем выкладзеных там тэарэтычных ведаў. Найбольш цесная ўзаемасувязь ажыццяўляецца з харавым класам. Асноўныя формы работы – урочна-рэпетыцыйная і канцэртная.

У працэсе заняткаў важнае значэнне маюць раскрыццё ідэйна-эмацыянальнага, вобразнага зместу харавога твора, выкарыстанне розных выканаўчых штрыхоў, пеўчай манеры, гукаўтварэння, звязаных з засваеннем рознамоўных тэкстаў і музычна-стылістычных адметнасцей. Вялікая ўвага надаецца распяванню, для чаго сістэматычна спяваюцца вакальна-харавыя практыкаванні, адпаведныя мэтам і задачам кожнага курса навучання.

Змест праграмы складзены з улікам як хрысціянскіх, так і свецкіх традыцый у развіцці харавога мастацтва. У ёй знайшлі храналагічнае адлюстраванне як нацыянальныя, міжканфесіянальныя музычныя традыцыі, так і стылі, школы і кірункі розных эпох ад Сярэднявечча да пачатку XX ст.

Значнае месца ў праграме адведзена беларускай старадаўняй музыцы, а таксама музыцы сучасных кампазітараў на тэматыку старажытных часоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма пабудавана па прынцыпе паступовасці ў засваенні старадаўняй харавой музыкі. Навучанне пачынаецца з твораў напеўнага характару невялікага дыяпазону, заснаваных на харавым унісоне. На іх адпрацоўваюцца адзіная манера гукаўтварэння, ланцуговае дыханне, унісонны строй і іншыя кампаненты. Ад курса да курса ўскладняюцца вакальна-харавыя і музычныя задачы.

Харавая фактура пры выкананні будуецца ад простай гамафонна-гарманічнай да складанай паліфанічнай, заснаванай на кантрапунктах.

Метады і тэхналогіі навучання заснаваны на прымяненні спецыяльных спеўна-вакальных практыкаванняў сучасных дыхальных методык і сістэм, якія садзейнічаюць адзінству тэмбральнага гучання ў працы над унісонам, вывучэнню ладава-інтанацыйных асаблівасцей у стылістыцы таго ці іншага кірунку старадаўняй музыкі.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам вывучэнне дысцыпліны «Клас старадаўняй харавой музыкі» разлічана ўсяго на 640 гадзін, з якіх 312 гадзін – аўдыторныя (практычныя) заняткі. Рэкамендаванай формай кантролю ведаў на працягу навучання з’яўляюцца залікі і экзамены.

Вывучэнне дысцыпліны рэкамендавана заканчваць дзяржаўным экзаменам па спецыялізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўд. (практ.) гадзін |
|---|---|
| **Уводзіны** | 1 |
| **Раздзел I. Харавая музыка Сярэднявечча** | |
| ***Тэма 1.*** Хрысціянская культавая харавая музыка:<br>а) знаменны распеў у праваслаўнай традыцыі;<br>б) грыгарыянскі харал у каталіцкай традыцыі | 21 |
| ***Тэма 2.*** Музычныя і стылістычныя асаблівасці выканання культавай музыкі:<br>а) акапэльная аднагалосая традыцыя, заснаваная на папевачным прынцыпе ў аб'ёме гексахорда;<br>б) інструментальныя рысы, аднагалосая традыцыя, стрыманасць і ўзнёсласць пачуцця | 22 |
| **Раздзел II. Музычная культура эпохі Адраджэння** | |
| ***Тэма 3.*** Заходнееўрапейская рэнесансная музыка. Паліфанічны стыль у харавых, свецкіх і духоўных жанрах шансону, мадрыгала, матэта, месы (творы італьянскіх, нідэрландскіх, французскіх, нямецкіх кампазітараў XV–XVI стст.) | 26 |
| ***Тэма 4.*** Харавая музыка эпохі Рэфармацыі на землях Польшчы і Беларусі (сярэдзіна XV ст.). Вакальна-харавыя творы М. Гамулкі, В. з Шамотул, Ц. Базыліка | 30 |
| **Раздзел III. Стыль барока ў музычнай культуры (Заходняя Еўропа, Беларусь, Расія, XVII ст.)** | |
| ***Тэма 5.*** Харавыя творы эпохі барока ў заходнееўрапейскай музыцы XVII ст. (А. Вівальдзі, І.-С. Бах, Г.-Ф. Гендэль) | 32 |
| ***Тэма 6.*** Барочны стыль у праваслаўнай шматгалосай традыцыі – трохрадковае спяванне, партэсны канцэрт (XVII ст.). Харавая культура кантаў і псалмоў. Штодзённае і «хатняе» партэснае шматгалоссе XVII–XVIII стст. («Рыфматворны псалтыр» С. Полацкага, В. Цітова) | 32 |
| **Раздзел IV. Музычная культура эпохі Асветніцтва (Заходняя Еўропа, Беларусь, Расія, XVIII ст.)** | |
| ***Тэма 7.*** Харавая музыка эпохі Асветніцтва і класіцызму: барочны класіцызм, асветніцкі класіцызм (І. Гайдн, В.-А. Моцарт, Л. Бетховен) | 34 |
| ***Тэма 8.*** Выканаўчы стыль рускага духоўнага канцэрта другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. (А. Ведэль, М. Беразоўскі, Д. Бартнянскі, А. Архангельскі, С. Дзегцяроў) | 34 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| **Раздзел V. Рамантызм як напрамак у музычнай культуры (Заходняя Еўропа, Беларусь, Расія, XIX ст.)** | |
| ***Тэма 9.*** Харавая музыка перыяду рамантызму:<br>а) харавая музыка сімвалістаў (Р. Шуман, Ф. Шуберт, І. Брамс, С. Манюшка);<br>б) імпрэсіянізм як напрамак ў музычнай культуры Расіі (В. Казлоўскі, А. Вярстоўскі) | 16 |
| ***Тэма 10.*** Імпрэсіянізм як напрамак у музычнай культуры Францыі ( М. Равель, К. Дэбюсі) | 14 |
| **Раздзел VI. Харавая лірычная песня** | |
| ***Тэма 11.*** Мужчынская харавая грамадзянская лірыка XVII–XVIII стст. (рэкруцкія, салдацкія песні, песні казацкай вольніцы) | 24 |
| ***Тэма 12.*** Працяг работы над папярэдняй тэмай і падрыхтоўкай да дзяржаўнага экзамену | 26 |
| Усяго… | 312 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Гісторыя з'яўлення старадаўняй харавой музыкі з яе асаблівай і адметнай стылістыкай, спосабам і манерай выканання. Назапашванне музычнага матэрыялу ў розных эпохах, школах, кірунках. Цесная сувязь замежнай, рускай і беларускай музыкі з агульнаеўрапейскім музычным працэсам.

Узаемадзеянне з іншымі музычнымі дысцыплінамі кафедры, прадметамі музычна-тэарэтычнага, філасофска-эстэтычнага і музычна-педагагічнага цыклаў. Пашырэнне і ўзбагачэнне музычнага інтэлекту, прафесійнага майстэрства, авалодванне практычнымі навыкамі рэпетыцыйнай работы і хормайстарскай працы.

Авалодванне методыкамі стварэння і кіравання разнастайнымі харавымі калектывамі. Паступовае ўскладненне ад курса да курса вакальна-харавых і музычных задач.

## Раздзел I. Харавая музыка Сярэднявечча

### *Тэма 1. Хрысціянская культавая харавая музыка: а) знаменны распеў у праваслаўнай традыцыі; б) грыгарыянскі харал у каталіцкай традыцыі*

Традыцыі старадаўняй хрысціянскай музыкі знаменнага распеву і грыгарыянскага хоралу ў сучаснай нотнай транскрыпцыі, заснаваныя на адзіным меладычным папевачным прынцыпе, паступовым рухам мелодыі ў аб'ёме тэрцыі і кварты з апяваннем крайніх апорных гукаў і перыядычнай зменай устояў у папеўках, аднагалосай манеры спявання (a cappella) з адзінствам гукавышыннага тэмбравага ўвасаблення, адзінага эмацыянальнага настрою.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2. Музычныя і стылістычныя асаблівасці выканання культавай музыкі: а) акапэльная аднагалосая традыцыя, заснаваная на папевачным прынцыпе ў аб'ёме гексахорда; б) інструментальныя рысы, аднагалосая традыцыя, стрыманасць і ўзнёсласць пачуцця*

Аднагалосая акапэльная традыцыя, заснаваная на папеўках з паступенным развіццём у аб'ёме гексахорда з суровым урачыстым характарам.

## Раздзел II. Музычная культура эпохі Адраджэння

### *Тэма 3. Заходнееўрапейская рэнесансная музыка. Поліфанічны стыль у харавых, свецкіх і духоўных жанрах шансону, мадрыгала, матэта, месы (творы італьянскіх, нідэрландскіх, французскіх, нямецкіх кампазітараў XV–XVI стст.)*

Заходнееўрапейская рэнесансная музыка. Свецкія і культавыя харавыя творы італьянскіх, нідэрландскіх, французскіх і нямецкіх кампазітараў XV–XVI стст. (Г. Дзюфэ, Т. Окегем, Ж. Дэпрэ, А. Ласа, Дж. Палестрына, Кл. Жанекен, І. Экард). Вакальнасць музычных жанраў, пераемнасць традыцый, дваістасць мыслення, наватарства ў стварэнні поліфанічнай харавой музыкі («строгі стыль»). Стылістычныя і жанравыя асаблівасці як асобных кампазітараў і іх твораў, так і пэўных перыядаў у дзейнасці прадстаўнікоў той ці іншай школы.

### *Тэма 4. Харавая музыка эпохі Рэфармацыі на землях Польшчы і Беларусі (сярэдзіна XV ст.). Вакальна-харавыя творы М. Гамулкі, В. з Шамотул, Ц. Базыліка*

Вакальна-харавая музыка эпохі Рэфармацыі на беларускіх і польскіх землях з сярэдзіны XVI ст. Псалмы М. Гамулкі, В. з Шамотул, песні Ц. Базыліка, прафесійная (манадыйная) і шматгалосая (партэсная) харавая музыка, яе вобразна-стылявыя адзнакі ў эмацыянальнай стрыманасці, дакладнай агогіцы і фразіроўцы, тэмбравым адзінстве галасоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Стыль барока ў музычнай культуры (Заходняя Еўропа, Беларусь, Расія, XVII ст.)

### *Тэма 5. Харавыя творы эпохі барока ў заходнееўрапейскай музыцы XVII ст. (А. Вівальдзі, І.-С. Бах, Г.-Ф. Гендэль)*

Стыль барока ў заходнееўрапейскай музыцы (канец XVI–XVII – сярэдзіна XVIII ст.). Супрацьстаянне ідэальнага і пачуццёвага, волі і розуму чалавека і рацыянальнасці быцця, зварот да драматычных, экспрэсіўных і трагічных вобразаў, імкненне да манументальнасці і пышнай дэкаратыўнасці, вылучэнне прынцыпу канцэртнасці і сінтэзу розных відаў мастацтва, стварэнне так званага вольнага стылю, з'яўленне музычна-тэатральных жанраў. Росквіт культавай музыкі (духоўныя араторыі, кантаты, пасіёны, магніфікат, месы) найперш у творчасці Г.-Ф. Гендэля і І.-С. Баха.

### *Тэма 6. Барочны стыль у праваслаўнай шматгалосай традыцыі – трохрадковае спяванне, партэсны канцэрт (XVII ст.). Харавая культура кантаў і псалмоў. Штодзённае і «хатняе» партэснае шматгалоссе XVII–XVIII стст. («Рыфматворны псалтыр» С. Полацкага, В. Цітова)*

Барочны стыль у праваслаўнай шматгалосай традыцыі – трохрадковае спяванне і партэсныя кампазіцыі, створаныя ў брацкіх школах на тэрыторыі Беларусі і Украіны ў першай палове XVII ст. прадстаўнікамі культавай музыкі і кампазітарамі другой паловы XVII ст. Стылістычныя асаблівасці: пераемнасць як са старым знаменным распевам, так і культавай паліфанічнай музыкай Заходняй Еўропы, уздзеянне сілабічнай прафесійнай паэзіі (С. Полацкі) і новай бытавой лірыкі.

Харавая культура кантаў і псалмоў; іх пэўны вобразна-эмацыянальны настрой і характар. Выразнае вымаўленне тэксту, дынамічныя кантрасты, натуральнасць і пранікнёнасць выканання.

Партэсны канцэрт. Супастаўленне харавых груп і тэмбрава-дынамічных кантрастаў, выкарыстанне паліфанічных прыёмаў (імітацыя, канон, «падгалосачная гетэрафонія»). Разнастайнасць, стракатасць фарбаў. Ансамблевая самастойнасць харавой «адзінкі» – станіцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел IV. Музычная культура эпохі Асветніцтва (Заходняя Еўропа, Беларусь, Расія, XVIII ст.)

### *Тэма 7. Харавая музыка эпохі Асветніцтва і класіцызму: барочны класіцызм, асветніцкі класіцызм (І. Гайдн, В.-А. Моцарт, Л. Бетховен)*

Музыка венскіх і нямецкіх класікаў: барочны класіцызм і асветніцкі класіцызм; дакладнасць і рацыяналізм мыслення, аптымізм светаўспрымання, гуманістычныя ідэалы, дэмакратычная скіраванасць. Адзінства формы і зместу, шырокі дыяпазон вобразнай сферы, рэльефнасць меладычнага матэрыялу, ладатанальныя дынамічныя кантрасты, сувязь з нацыянальнымі мастацкімі культурамі. Гамафонна-гарманічны прынцып пабудовы фактуры, плаўнасць рытму, камерная празрыстасць гучання, ураўнаважанасць і сіметрыя музычных частак. Адлюстраванне жанрава-бытавых элементаў і праграмная маляўнічасць (І. Гайдн), абагульненне папярэдніх традыцый, высокія дасягненні ў поліфанічным майстэрстве (В.-А. Моцарт). Музыка Л. Бетховена – перыяд магутнай філасофскай глыбіні, рэвалюцыйнага пафасу, інтэлектуальнай і псіхалагічнай асэнсаванасці, героіка і драматызм жыццесцвярджэння.

### *Тэма 8. Выканаўчы стыль рускага духоўнага канцэрта другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. (А. Ведэль, М. Беразоўскі, Д. Бартнянскі, А. Архангельскі, С. Дзегцяроў)*

Выканаўчы стыль рускага духоўнага канцэрта (другая палова XVIII – пачатак XIX ст.). З’яўленне новых рыс свецкасці (урачыстая харавая музыка) і адпаведна новых жанраў. Апрацоўкі народных песень, панегірычныя канты, гімны, кантаты, араторыі, паланэзы з хорам. Творчасць кампазітараў Д. Бартнянскага і М. Беразоўскага – чарговы этап у развіцці харавой музыкі a cappella і новай яе формы – духоўнага канцэрта. Адвольная цыклічная форма, заснаваная на кантрасце частак, складанае тэматычнае развіццё, багацце поліфанічнага пісьма (фуга і фугата). Творчае ўвасабленне ў музыцы знаменнага распеву, партэснай музыкі і ўкраінскай народнай песні. Вобразныя адценні лірычнага настрою музыкі Д. Бартнян-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скага, гамафонна-гарманічны стыль, насычанасць і паўната гучання, чысціня і яснасць каларыту, тэмбравыя кантрасты, супастаўленні розных груп хору, паступовае развіццё дынамікі. Творчасць кампазітараў В. Казлоўскага, А. Вярстоўскага, С. Дзегцярова, Г. Ламакіна. Апрацоўка народных песень, камерная харавая музыка, оперныя і сімфанічныя хары, хары для розных складоў галасоў, духоўная музыка. Народнасць і праўдзівасць – асноўныя рысы творчасці кампазітараў-«кучкістаў» і П. Чайкоўскага. Тэмы трагедыйнасці ў харавой творчасці С. Танеева, С. Рахманінава.

## Раздзел V. Рамантызм як напрамак у музычнай культуры (Заходняя Еўропа, Беларусь, Расія, XIX ст.)

### *Тэма 9. Харавая музыка перыяду рамантызму: а) харавая музыка сімвалістаў (Р. Шуман, Ф. Шуберт, І. Брамс, С. Манюшка); б) імпрэсіянізм як напрамак у музычнай культуры Расіі (В. Казлоўскі, А. Вярстоўскі)*

Рамантычны кірунак у мастацтве Заходняй Еўропы: канфліктнае ўспрыманне і гіпербалізацыя жыццёвых з'яў (ідэалізацыя мінулага, матывы трагічнай наканаванасці), вылучэнне двух тыпаў рамантычнага героя: выключная асоба (Вагнер, Берліёз) і просты чалавек (Шуберт, Шуман, Брамс, Мендэльсон). Важнейшыя сферы творчасці – лірыка (лірычная мініяцюра, лірычная споведзь), фантастыка, дакладнае ўвасабленне «вакальнага каларыту» (праз прыроднае і нацыянальна-характэрнае). Вядучыя музычныя жанры – песня-балада, вакальны цыкл, раманс (харавы раманс), сімфанічная паэма. Нацыянальная харавая музыка школ Германіі, Аўстрыі, Італіі, Францыі, Польшчы.

Рамантызм – руская музыка пачатку XIX ст.

### *Тэма 10. Імпрэсіянізм як напрамак у музычнай культуры Францыі (М. Равель, К. Дэбюсі)*

Імпрэсіянізм (фр. – уражанне): перадача непасрэднага ўражання ад прыгажосці, асалода ад «незямнога» звышвытанчанага вобраза, цікавасць да таямнічага, незразумелага, казачна-фантастычнага. Сувязь з паэзіяй сімвалістаў, апора на тан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чэйшую інтуіцыю – «эстэтыка ўражанняў». У музыцы (К. Дэбюсі, М. Равель) – аслабленне значэння мелодыі, узмацненне ролі асобных гукаў, чароўны ладагарманічны і тэмбравы каларыт пры перадачы гукавога пейзажу, няўлоўнага настрою, сумнага пачуцця ці адчування. Характэрныя рысы – праграмнасць, сюітнасць, цыклічнасць, зварот да мініяцюрных формаў, казачных і міфалагічных сюжэтаў усходняй і іспанскай музыкі.

## Раздзел VI. Харавая лірычная песня

### *Тэма 11. Мужчынская харавая грамадзянская лірыка XVII–XVIII стст. (рэкруцкія, салдацкія песні, песні казацкай вольніцы)*

Працяжная лірычная песня (XVI–XVIII стст.), яе сувязь з мужчынскай харавой традыцыяй. Шырокія распевы і дыяпазон, разнастайныя віды мелодыкі (напеўна-дэкламацыйны, адвольныя распевы, рэчытатыўныя запевы), багацце поліфанічнага выкладу.

Беларуская казацка-сялянская сацыяльная лірыка, гераічны кант XVI–XVII стст. Харавая двух-, трохгалосая аснова (з падводкай), элементы заклінання і прамога звароту да слухача, яркая эмацыянальнасць з рэгістравымі кантрастамі, сувязь з разнастайнымі бытавымі жанрамі, нацыянальным зместам.

Рэкруцкія, салдацкія, батрацкія і іншыя песні. Сувязь беларускіх паўстанцкіх і рэкруцкіх песень, уздзеянне культуры канта на салдацкія песні. 13-складовая структура верша з зацягваннем другога склада, пераменнасць (кварта-квінтавая праз наслаенне тэрцавай уторы), шчыльнасць і роўнасць гучання, дэталёвае выпяванне ўсіх меладычных зваротаў, ладавая аднароднасць.

### *Тэма 12. Працяг работы над папярэдняй тэмай і падрыхтоўкай да дзяржаўнага экзамену*

Падрыхтоўка канцэртнай праграмы да дзяржаўнага экзамену, які ўключае харавыя творы з розных раздзелаў і тэм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Асафьев, Б. В.* О хоровом искусстве / Б. В. Асафьев; сост. А. Б. Павлова-Арбенина. – Л.: Музыка, 1980. – 215 с.

2. *Асафьев, Б. В.* Русская музыка XIX – нач. XX в. / Б. В. Асафьев. – 2-е изд. – Л.: Музыка, Ленинградское отд., 1979. – 344 с.

3. *Беларускія* канты / склад. Л. П. Касцюкавец. – Мінск, 1978.

4. *Вагнер, Р.* Избранные работы / Р. Вагнер; редкол. и предисл. М. Ф. Овсянников [и др.]. – М.: Искусство, 1978. – С. 142–262.

5. *Гісторыя* беларускай савецкай музыкі / агульн. рэд. Г. С. Глушчанкі. – Мінск: Выш. шк., 1971. – 542 с.

6. *Дадзіёмава, В. У.* Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі / В. У. Дадзіёмава. – Мінск: БДАМ, 2001. – 256 с.

7. *Друскин, М.* История зарубежной музыки. Вторая половина XIX в. / М. Друскин. – М.: Музыка, 1980. – Вып. 4. – 527 с.

8. *Ильин, В.* Очерки истории русской культуры 2-й пол. XVII – нач. XX ст. / В. Ильин. – М.: Сов. композитор, 1985. – 232 с.

9. *История* зарубежной музыки: конец XIX – начало XX ст. / ред. И. Нестьева. – М.: Музыка, 1988. – Вып. 5.

10. *История* русской музыки: в 10 т. / сост.: Л. Акопян, А. Булычева, Р. Берченко [и др.]; редкол.: Ю. Келдыш, Л. Корабельникова, Е. Левашев [и др.]. – М.: Музыка, 1985–2004. – Т. 10: 1890–1917 гг.

11. *Костюковец, Л. Ф.* Кантовая культура в Белоруссии / Л. Ф. Костюковец. – Минск: Выш. шк., 1975. – 96 с.

12. *Келдыш, Ю. В.* Русская музыка XVIII ст. / Ю. В. Келдыш. – М.: Музыка, 1965.

13. *Конен, В.* История зарубежной музыки / В. Конен. – 6-е изд., доп. – М.: Музыка, 1984. – Вып. 3. – 634 с.

14. *Левик, Б. В.* История зарубежной музыки / Б. В. Левик. – 4-е изд., испр. – М.: Музыка, 1980. – Вып. 2. – 277 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*15. Ливанова, Т.* История западноевропейской музыки до 1789 г.: в 2 кн. / Т. Ливанова. – М.: Музыка, 1986. – Кн. 1: От Античности к XVIII в. – 462 с.: нот.

*16. Ливанова, Т.* История западноевропейской музыки до 1789 г.: в 2 кн. / Т. Ливанова. – М.: Музыка, 1987. – Кн. 2: От Баха к Моцарту. – 469 с.: нот.

*17. Літургічная* музыка Беларусі XVIII ст.: хрэстаматыя / склад. Т. Н. Ліхач. – Мінск, 1993.

*18. Музыка* Австрии и Германии XIX в.: в 2 кн. / под общ. ред. Т. Э. Цитович. – М.: Музыка, 1975–1980.

*19. Музыка* Беларусі XVII ст. (Рыфматворны псалтыр) / склад. Л. П. Касцюкавец. – Мінск: БДАМ, 1991.

*20. Музыкальная* эстетика Западной Европы XVII–XVIII стст. – М., 1971.

*21. Музычны* тэатр Беларусі: у 4 т. / склад. Г. Р. Куляшова [і інш.]; навук. рэд. Г. Р. Куляшова. – Мінск: Беларус. навука, 1990–1998.

*22. Пракапцова, В. П.* Мастацкая адукацыя ў Беларусі / В. П. Пракапцова. – Мінск: БУК, 1999. – 210 с.

*23. Пякуцька, А.* Духоўная харавая музыка: вучэб.-метад. дапам. / А. Пякуцька, З. Леановіч, В. Маеўская. – Мінск: БДУК, 1996. – 156 с.

*24. Ренессанс.* Барокко. Классицизм: проблема стилей в западно-европейском искусстве XV–XVII стст. – М., 1966. – 254 с.

*25. Стасов, В. В.* Статьи о музыке: в 5 т. / В. В. Стасов. – М.: Музыка, 1974–1980.

*26. Харавая* музыка. Літургія / уклад. А. Пякуцька [і інш.]. – Мінск, 1994. – 103 с.

*27. Энцыклапедыя* літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск: БелСЭ імя П. Броўкі. – 1984–1987.

*Дадатковая*

*1. Гажэўская, Т. С.* Табе, Прачыстая Багародзіца!: вучэб.-метад. дапам. / Т. С. Гажэўская. – Мінск: БДУКМ, 2009. – 327 с.

*2. Сокровищница* русской духовной музыки / сост. Б. Тевлин. – М.: Музыка, 2000. – 165 с.

*3. Хоровой* концерт: произведения зарубежных композиторов XVI–XX вв. / сост. С. Ерохина. – Минск: Лимариус, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Прыкладны рэпертуар

1. Напевы з Супрасльскага ірмалоя (глас 1).
2. Напевы з Жыровіцкага ірмалоя (глас 8).
3. Паплаўскі Я. Тры выбраныя распевы з Супрасльскага ірмалагіёна, № 3.
4. Рэспансорый Sient ovis.
5. Benedicamus «Месы ў гонар Дзевы Марыі і Нараджэння Хрыстова».
6. Дюфэ Г. Угасает день. Vergine bella.
7. Дэпрэ Ж. Adieu, mes amours. Stabat mater.
8. Жанекен К. Пение птиц. Песня. Охота.
9. Палестрина Дж. Magnificat. В синем небе. На берегу Тибра.
10. Ласа А. Эхо. Matona mia cara. Покаянные псалмы.
11. Віторыя Т. Nenebra factae sunt.
12. Гамулка М. Псалмы 6, 110, 119, 120.
13. Вацлаў з Шамотул. Псалом 85 «Малітва, калі дзеці ідуць спаць».
14. Базылік Ц. Набожная песня.
15. Вівальдзі А. Ночка.
16. Бах І.-С. Страсці па Матфею (фрагм.). Меса h-moll (фрагм.).
17. Гендель Г.Ф. Мессия (фрагм.). Halleluja с оратории «Израиль в Египте».
18. Ірмас. «Хрыстос нараджаецца» (пуцявы распеў).
19. Канты і псалмы: «Маленне», «Сумная маці», «Нова радасць стала», «На гарах Кранштацкіх», «Цудоўныя дні», «Неба і зямля».
20. Полацкі С., Цітоў В. Рыфматворны псалтыр (па выбары).
21. Титов В. «Радуйтесь Богу, помощнику нашему» – 12-галосы канцэрт (фрагменты).
22. Моцарт В.-А. Ave Verum corpus.
23. Моцарт В.-А. Рэквіем (фрагм.). Месса C-dur (фрагм.).
24. Гайдн І. Араторыя «Поры года» (фрагм).
25. Бетховен Л. Missa Solemnis (фрагм.).
26. Бетховен Л. Меса C-dur (фрагм.).
27. Вагнер Г. Хор моряков из оперы «Летучий голландец».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

28. Березовский М. Хоровой концерт «Помышляю день страшный».

29. Бортнянский Д. Харавы канцэрт № 32, 33 (фрагм.).

30. Бортнянский Д. Слава в вышних Богу. Херувимская, № 7.

31. Дегтерев С. Все языцы елики сотворил еси.

32. Архангельский А. Милость мира. Тебе поем.

33. Ломакин Г. Хвалите имя Господне.

34. Костальский Д. Милость мира. Тебе поем.

35. Чайкоўскі П. Літургія (фрагменты).

36. Часнакоў П. Літургія (фрагменты).

37. Рахманинов С. Концерт для хора «В молитвах не усыпающую Богородицу».

38. Рахманинов С. Богородице Дево, радуйся (из «Всенощного бдения»).

39. Грачанинов А. Иже херувимы.

40. Иполитов-Иванов М. Благослови, душе моя, Господа.

41. Шуман Р. Цыгане. Доброй ночи.

42. Шуман Р. Хоры из ораторий «Буря», «Рай и Пери».

43. Шуберт Ф. Вечерняя песня. Хоровод. Любовь.

44. Шуберт Ф. Месы as-dur, Es-dur (фрагм.).

45. Равель М. Николетта.

46. Дебюсси К. Зима.

47. Манюшка С. Праснічка.

48. Сметана Б. Хор крестьян из оперы «Проданная невеста».

49. Равенскі М. Апр.нар.песні «Ой, высоча» (лірычная).

50. Наско Э. Апр.нар.песні «Ой, ды забалела маё сэрцайка».

51. Наско Э. Апр.нар.песні «Ой, хадзіла дзяўчоначка» (рэкруцкая).

52. Наско Э. Апр.нар.песні «А ў бары, бары» (жаўнерская).

53. Наско Э. Апр.нар.песні «Ой, на горі, та женцы жнуць» (казацкая)

54. Мусоргский М. Ты взойди, солнце красное (обр.).

55. Мусоргский М. Поражение Сеннахериба.

56. Балакіраў М. Апр. нар. песні «Эй, ухнем!»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**КЛАС СТАРАДАЎНЯЙ ХАРАВОЙ МУЗЫКІ**

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-18 01 01*
*Народная творчасць (па напрамках)*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-01 01*
*Харавая музыка акадэмічная*


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,87. Ул.-выд. арк. 0,64.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ